ПАРНАС

# І добра ж, як няма вайны

Ёсць у мяне, сябры, навіна.
Аб ёй хачу распавядаць.
Мой край – адзіная мясціна,
Дзе сэрцу хочацца спяваць.
Звярам і птушкам –
вось раздолле,
Буслы тут крочаць як паны.

І грэе душу наваколле,
І добра ж, як няма вайны.
Тут па-асобаму, здаецца,
Расце трава, шуміць чарот.

Гасцінным спрадвякоў завецца
Палескі шчыры наш народ.
З Чырвонай кнігі –
фаўна, флора...
Час у гісторыю плыве.
І будзе ЗАЎТРА
лепш за УЧОРА,
Бо тут народ такі жыве!

**Жанна ВЕРЫЧ,**
**метадыст**
**Цэнтра творчасці.**